**УДК 821.161.3.09**

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ МАСТАЦКІХ КАТЭГОРЫЙ І ВОБРАЗАЎ ПРЫ АСВАЕННІ ВАЕННАЙ ТЭМЫ В. БЫКАВЫМ У АПОВЕСЦІ 1980 – 1990-х гг.

***канд. філал. навук, дац. Т.Р. БАГАРАДАВА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаецца эвалюцыя мастацкіх вобразаў і катэгорый у жанры аповесці вядомага класіка беларускай літаратуры В. Быкава ў перыяд 1980-х – 1990-х гг. Аналізуюцца так званыя «гарызантальныя» літаратурныя ўплывы, якія выяўляюцца праз мастацкія ўзаемадачыненні пісьменніка з іншымі аўтарамі (пераважна прадстаўнікамі «лейтэнанцкай прозы»), равеснікамі, калегамі па пяру. Прасочваецца мастацкі шлях В. Быкава ад ўвасаблення ідэй «рэмаркізму», партызанскіх аповесцей да прытчава-парабалічнага адлюстравання рэчаіснасці і выкарыстання экзістэнцыйнай эстэтыкі. Антываенны пафас і рэалізм выводзяць мастака, а разам з тым і нацыянальнае пісьменства, на сусветны ўзровень. Былы франтавік В. Быкаў у літаратуры займаўся перш за ўсё пошукамі чалавека, што выявілася праз ідэйна-эстэтычную паэтыку жанра аповесці.*

***Ключавыя словы:*** *рэалістычная паэтыка, экзістэнцыйнае светаадчуванне, рэмаркізм, прытчавы пачатак, гуманістычны пафас, метафізічная мова.*

**Уводзіны.** Айчынны пісьменнік Васіль Быкаў (1924–2003) пасля заканчэння Саратаўскага пяхотнага вучылішча меў уласны ваенны досвед баявых аперацый на Украінскім, Румынскім, Балгарскім, Венгерскім, Югаслаўскім, Аўстрыйскім франтах, быў вайскоўцам у Беларусі, ва Украіне, таксама на Далёкім Усходзе. У мастацкай практыцы пісьменніка пытанні чалавечага быцця сталі прыярытэтнымі і атрымалі індывідуальны разгляд. Актуальнасць даследавання заключаецца ў вызначэнні ў эстэтыцы мастака экзістэнцыйных элементаў, увасобленых праз антываенную, гуманістычную і рэалістычную паэтыку. *Мэтай* дадзенай працы стаў разгляд эвалюцыі мастацкага светаўспрымання пісьменніка ў перыяд 1980-х – 1990-х гг., а *задачамі* з'яўляецца разгляд і аналіз выяўленых праблем у аповесцях В. Быкава адзначанага перыяду.

Творчая манера празаіка атрымала станаўленне ў часы «хрушчоўскай адлігі», калі ў мастакоў слова з'явілася магчымасць рэалізацыі жыццёвага вопыту і індывідуальнасці. Сведчанні празаікаў-сучаснікаў таксама сталі аўтарытэтнымі пры стварэнні твораў пра вайну. Сам пісьменнік пра дадзеныя «гарызантальныя» ўплывы прыгадваў наступнае: «Пісаў я і пры поўным узаемаразуменні з маімі рускімі равеснікамі, аўтарамі таленавітых кніг пра вайну, сярод якіх у першую чаргу хочацца назваць Юрыя Бондарава і Рыгора Бакланава. Я многім таксама абавязаны Алесю Адамовічу, выдатнаму беларускаму празаіку і самаму ўдумліваму з маіх крытыкаў» [1, с. 81].

**Асноўная частка.** У *аснове працы* ляжаць пастулаты культурна-гістарычнага, параўнальна-гістарычнага метадаў, прыёмы цэласнага аналізу мастацкага тэксту, што дае магчымасць вылучыць вядучыя тэндэнцыі і формы раскрыцця ваеннай тэмы ў спадчыне пісьменніка-ветэрана, відавочцы ваенных падзей, а таксама вызначыць творчую пазіцыю аўтара з улікам змены гісторыка-культурнай парадыгмы.

Эвалюцыя В. Быкава ў адлюстраванні ваеннай рэчаіснасці прасочваецца на працягу ўсёй творчасці. «Лейтэнанцкая проза» з яе паказам чалавека на вайне прайшла ў мастацкай спадчыне аўтара трансфармацыю, увасобілася ў элементах эстэтыкі «рэмаркізму», працягнула сваё існаванне ў творах «партызанскага цыклу», дзе трагічнай стала сама праблема выбару і быцця на акупаванай тэрыторыі. П. Дзюбайла адзначаў: «Аповесці В. Быкава ставяць вельмі важную для сучаснай літаратуры праблему выбару і адказнасці чалавека за свой лёс, за свае ўчынкі» [2, с. 188]. Пісьменнік выпрацоўваў канцэпцыю чалавека на вайне, якая па сутнасці і вектары развіцця таксама з'яўляецца эвалюцыйнай. Па словах М. Тычыны, «мастацкая творчасць В. Быкава з часам пачынала ўспрымацца і самім аўтарам, і яго крытыкамі як цэласная сістэма, якая мае сваю логіку руху і развіцця» [3, с. 662]. Пачатковая спроба адлюстравання вайны прадстаўлена ў аповесці «Жураўліны крык» (1959) і ўяўляла сабой першую эвалюцыйную прыступку да ўзнаўлення ваенных рэалій. М. Тычына адзначаў: «Творчы вопыт папярэднікаў (К. Чорнага, М. Лынькова, І. Мележа) пераканаўча сведчыў супраць псіхалагічна паглыбленай эпапейнасці і панарамнасці ў паказе ваенных падзей. Быкаў абраў аптымальны варыянт рэалізацыі сваёй задумы, паставіўшы ў цэнтр сюжэта шараговага салдата ў межах адзінкавага эпізоду. Такім чынам, жанр аповесці стаў вызначальным для актуалізацыі лакалізаванага сюжэта пісьменніка. Акрамя таго, па словах У. Навумовіча, «вялікую ролю ў творах В. Быкава адыгрывае мадэляванне абставін, у якіх выяўляецца сутнасць чалавека» [4, с. 450].

Творча-выяўленчы план літаратурнай спадчыны В. Быкава эпохі 1980-х – 1990-х з'яўляецца якасна новым і эвалюцыйным, характарызуючыся паглыбленнем экзістэнцыйнай праблематыкі чалавечага выбару і распрацоўкай у апавядальнай канве твораў паэтыкі прытчы. Па вызначэнні У. Навумовіча [4, с. 450], В. Быкаў развівае традыцыі прытчавага пачатку Б. Брэхта, А. Камю, Ж.-П. Сартра, Ф.М. Дастаеўскага, Л.М. Талстога, К. Чорнага, Я. Коласа. Зборнікі «Сцяна» (1997), «Пахаджане» (1999), «Калі рукаюцца душы» (2003, разам з Р. Барадуліным), «Парадоксы жыцця» (2005) у шэрагу апавяданняў увасобілі экзістэнцыйную катэгорыю «яснасць бачання».

Некаторыя агульнапрынятыя ў савецкай літаратуры трактоўкі мінулага, прырода іх узнікнення і формы адлюстравання ў перыяд 1980 – 1990-х гг. былі пераасэнсаваны пісьменнікам. Экстрэмальныя абставіны і псіхалагічнае напружанне ў перыяд ваенных дзеянняў выяўляюць для чалавека трагічныя і гераічныя моманты.

А. Бельскі падкрэсліваў: «Быкаў лічыў сваім абавязкам пісьменніка-грамадзяніна выкрываць жорсткасць і бесчалавечнасць вайны» [5, с. 132]. Экстрэмальнае ўспрыманне рэчаіснасці («болевы шок») і фактар страху неад'емна суправаждаюць чалавека ва ўмовах ваенных рэалій, часта становяцца прычынай здзейсненых салдатамі подзвігаў. В. Быкаў пісаў: «Калі цябе камандзір абяцае расстраляць пад ранак, калі ты не возьмеш страчаны хутар, ці вышыню, ці траншэю (што па тым часе зусім верагодна), дык яшчэ невядома, каго ты пачынаешь баяцца болей – немцаў ці камандзіра» [6, с. 93]. Відавочная паралель паміж поглядамі В. Быкава і С. К'еркегора [180], які звязваў з тэорыяй страху тэорыю поўнай адзіноты чалавека ў адносінах да Бога. С. К'еркегор з тэмай поўнай чалавечай адзіноты і В. Быкаў з гуманістычнымі заклікамі суладныя ў сцвярджэнні трагічнасці чалавечага лёсу.

Пачынаючы з 1980-х гг., пісьменнік часта звяртаўся да трагічных момантаў даваеннай айчыннай гісторыі. Распачынае дадзены перыяд аўтарская аповесць «Знак бяды» (1982). Твор узнаўляе настроі постперыяду «адлігі», калі аўтабіяграфічны і лірычны пачатак у прозе замяняецца драматычным адлюстраваннем рэчаіснасці. Пісьменнік пазбягаў традыцыйнага падзелу персанажаў на цалкам станоўчыя ці адмоўныя. Маючы шматгранны характар, герой В. Быкава перш за ўсё з'яўляецца асобай. Твор «Знак бяды» прапагандуе ідэю ўнікальнасці жыцця кожнага чалавека на фоне дамінанты агульначалавечых каштоўнасцей. Аповесць адлюстроўвае сувязь эпох. Часта ў кантэкст аповеду ўпісваецца прыём рэтраспекцыі: знаходжанне Багацькаў у парабках, стварэнне калгаса, раскулачванне заможных сялян. Гэты твор, па словах Д. Бугаёва, «адлюстраваў трагічную праўду часу з вялікай мастацкай сілай» [7, с. 58]. Такім чынам, у ім знайшлі ўвасабленне падзеі некалькіх гістарычных адрэзкаў часу: рэвалюцыі, калектывізацыі, Вялікай Айчыннай вайны. У завязцы твора В. Быкаў робіць акцэнт на гістарычнай повязі часоў, праблеме чалавечай памяці: *«Час і людзі няшмат пакінулі ад колішняй хутарской сядзібы»* [8, с. 4].

Стварэнне вобраза героя ў прозе пра вайну патрабавала ад пісьменнікаў асэнсавання катэгорыі патрыятызму. У гэтым плане эстэтыка В. Быкава ўжо ў 1960-я гг. істотным чынам адрознівалася ад установак літаратуры савецкага часу. В. Локун слушна заўважала: «Прозу Быкава вызначаў найвысокі ўзровень маральнага пачуцця, духоўнасці наогул, што выразна праяўляецца ў абмалёўцы герояў, іх гатоўнасці ахвяраваць сабой у імя вышэйшых мэт» [9, с. 12]. Праз рэфлексію і філасофскія разважанні персанажаў празаік раскрываў гістарычны кантэкст. Вобраз Петрака Багацькі са «Знаку бяды» працягвае галерэю вобразаў-тыпаў беларускага селяніна. У апазіцыі «чалавек – абставіны» кожная асоба мае магчымасць адпаведнага выбару. Сцепаніда Багацька з першых дзён свядома канфліктуе з няпрошанымі гасцямі-паліцаямі, змагаецца з ворагамі даступнымі спосабамі. У творы адлюстраваны працэс маральнага ўзмужнення чалавека, даведзенага ўплывам абставін да крытычнай мяжы. Аднадумцам Сцепаніды ў маральна-этычным плане заўсёды быў Пятрок. Даследчыкамі неаднаразова падкрэслівалася адметная сімволіка аповесці «Знак бяды»: камяні каля спаленай сядзібы, мёртвы жаўранак на зямлі, вісельнік Адольф Якімоўскі, спрацаваны конь, крыж на гары Галгофе. Назва твора таксама з'яўляецца сімвалам, які ў аповесці вар'іруецца ў розных праявах: замерзлы жаўрук, забітая варона, драўляны крыж у глеі, схаваная на ўзгорку бомба. У строгі і энергічны сюжэт В. Быкава арганічна ўпісваюцца бытавыя рэаліі, дэталі і падрабязнасці, якія вызначаны аўтарам дасканала і шматпланава. Яны ствараюць бытавы і гістарычны кантэкст: апаленая ліпа на падворку Багацькаў, разбураны калодзеж, зробленая з газеты самакрутка, скрыпка Петрака, прылады для прадзіва і ткацтва, грамата Сцепаніды за поспехі ў апрацоўцы лёну з гербам Беларусі і подпісам Чарвякова, газетны здымак Сталіна на сцяне і г.д. Аповесць з'яўляецца своеасаблівым сінтэзам лепшых традыцый вясковай і ваеннай прозы.

Твор В. Быкава «Кар'ер» (1985) стаў этапнай з'явай у пошуку форм, сродкаў адлюстравання ваеннай рэчаіснасці і пераломных момантаў гісторыі. Пісьменнік не адышоў ад аповесці як дамінуючай формы разгляду падзей вайны, а пашырыў выяўленчы план, павялічыў памер аповеду, што з'явілася адзнакай раманнага мыслення і элементам дынамікі жанравай формы ў творчасці мастака. І. Афанасьеў [10] падкрэсліў адыход В. Быкава ў творы ад прынцыпаў адлюстравання чалавека з этыкай соцыуму і зварот аўтара да індывідуальнай этыкі, да раскрыцця самакаштоўнасці і значнасці статусу асобы. Пісьменнік пашырыў тэматычны абсяг праз зварот да асваення новага для яго матэрыялу – дзейнасці падпольных груп у гады Вялікай Айчыннай вайны. У аповесці «Кар'ер» драматызуецца сітуацыя знаходжання чалавека на акупаванай тэрыторыі. Ваенныя дзеянні прымушаюць асобу рабіць экстраардынарныя ўчынкі. В. Быкаў ізноў, як і ў «Знаку бяды», ускладніў хранатоп твора. Традыцыйны для пісьменніка рэтраспектыўны прыём у аповесці «Кар'ер» уключыў паказ часавых пластоў паміж дзвюма войнамі, аповед пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны і адлюстраванне рэчаіснасці праз пункт гледжання Агеева-ветэрана на мінулае з 1980-х гг. В. Быкаў праз вобраз Алега Агеева больш падрабязна падаў маштабы трагедыі першых месяцаў вайны і стыхійнага характару падпольнага руху ў акупаванай Беларусі. Твор працягвае і псіхалагічна паглыбляе папярэдне ўзнятую ў «Сотнікаве» праблему наяўнасці ў чалавеку маральных якасцей, без якіх губляюцца жыццёвыя арыенціры. Так Агееў імкнецца даказаць падпольшчыкам сваю невінаватасць пасля падпісання паперы пра супрацоўніцтва з немцамі, але дадзены факт паказвае на адсутнасць у чалавеку маральнага стрыжня. Сын Агеева, Аркадзь таксама дабіваецца жыццёвых выгод не зусім сумленным шляхам, пра што сведчыць спекуляцыя ваеннымі заслугамі бацькі пры атрыманні ордэра на кватэру. Кажучы пра прысутнасць у творах экзістэнцыйных матываў, трэба адзначыць паказ аўтарам у аповесцях «Знак бяды» і «Кар'ер» ролі адказнасці кожнага чалавека за ход гісторыі: *«Але ўсё роўна думалася, бо клопат гэты ржавым цвіком тырчэў у галаве ўжо колькі часу, <…> і адчапіцца ад яго не было магчымасці»* [8, с. 43]. Праз выкарыстанне прыёмаў плыні свядомасці, пададзенай праз няўласна-простую мову, у аповесці «Знак бяды» ўвасабляюцца развагі герояў, іх меркаванні пра сітуацыю на фронце ва ўмовах адсутнасці аб'ектыўнай інфармацыі. У «Кар'еры» пісьменнік не толькі працягвае, але, дзякуючы разнастайнасці абранага матэрыялу і пашырэнню прасторава-часавых межаў, паглыбляе вырашэнне вядомай дылемы пра мэту і сродкі яе дасягнення, цану кожнага адказнага рашэння. Па словах Т. Прохаравай [11],

аповесць стала сінтэзам папярэдняга вопыту пісьменніка і яго новым вырашэннем. Агееў-ветэран, адчужаны нават ад блізкіх, шкадуе, што некалі паслаў цяжарную Марыю, якую кахаў, замест сябе на заданне-пагібель, і шукае яе парэшткі ў кар'еры – на раскапаным месцы расстрэлу падпольшчыкаў: *«Ён стаяў на тым самым абрыве, дзе сорак гадоў назад, ледзь стрымліваючы дрыжыкі ў скрываўленым целе, развітваўся з жыццём»* [12]. Прыём адлюстравання рэалій з розных пунктаў гледжання праясняе ў аповесці сутнасць і значнасць падпольнага руху для яго ўдзельнікаў. Сама назва «Кар'ер» відавочна мае на ўвазе тэму гістарычнай і чалавечай памяці. Герой аповесці пастаянна паглыбляецца ў развагі, звязаныя з экзістэнцыйнымі праблемамі. У фінале заўважныя экзістэнцыйная пераацэнка героем свайго мінулага, змена поглядаў на сябе і матывы сваіх былых учынкаў*: «Ён плакаў доўга, самазабыўна, як гэта здаралася з ім калісь у раннім дзяцінстве, – аб сабе і аб іх, непамерных людскіх пакутах, якія, аказваецца, ніколі не мінаюць бясследна»* [12].

Гістарычны кантэкст шматаспектна прадстаўлены пісьменнікам і ў аповесці «Бліндаж» (пісалася з 1987). Быційныя перыпетыі ў вёсцы Любашы з'яўляюцца тыповым прыкладам існавання соцень беларускіх мястэчак на памежжы 1930 – 1940-х гг. Аповесць засталася няскончанай, захоўваецца ў архіўных матэрыялах пісьменніка. Скіраванасць творчай думкі В. Быкава відавочная: гэта рух да адлюстравання ўсёй вастрыні тых трагічных сітуацый, у якія трапляў беларус у першай палове ХХ ст. Пачатковыя фрагменты аповесці «Бліндаж» прысвечаны жыхарцы вёскі Серафімцы, жыццёвы лёс якой тыповы ва ўмовах савецкай рэчаіснасці. Яе брата Мікалая абвінавацілі ў нацыяналізме і рэпрэсавалі. Серафімка ў выключных абставінах застаецца чалавекам духоўна моцным, яна адна хавае забітага салдата. Пісьменнік пераплятае фрагменты з жыццёвых лёсаў сваіх персанажаў, у фабуле выкарыстоўвае прыём нанізвання эпізодаў, ведучы чытача да характэрнай трагічнай развязкі. Жыццёвая сітуацыя сутыкае Серафіму з капітанам Хлебнікавым, які, будучы ў стане найвышэйшага маральнага напружання, намагаецца застрэліцца. Трагедыя «скампраметаваных» пастаяльцаў бункера мае аналагічныя прычыны: выпадзенне з сістэмы, сувязь з немцам, знаходжанне на акупаванай тэрыторыі. У недапісаных эпізодах з'яўляюцца новыя персанажы: яўрэй Нохем – фатограф з мястэчка; Качан – былы паліцай, які ўцёк ад немцаў. Па словах А. Пашкевіча [13], сюррэалістычная калізія стала прычынай таго, што абсалютна розныя людзі збіраюцца разам у бліндажы. З чарнавых накідаў відавочная трагедыя звар'яцелага капітана Хлебнікава і Серафімы, якая ахвяруе сабой дзеля людзей у бліндажы. Праблема калабарацыянізму, да якой В. Быкаў звярнуўся яшчэ ў аповесці «Знак бяды», часткова тлумачыцца людскімі драмамі з часоў стварэння калгаснай сістэмы. Твор «Бліндаж» праз паказ фрагментаў з жыцця амаральных Піліпёнкаў таксама адлюстраваў дадзеную тэму. У маральным сэнсе здраднікамі і заложнікамі сітуацыі становяцца таксама Агееў з твора «Кар'ер» і Ягор Азевіч з аповесці «Сцюжа». Наватарствам В. Быкава з'яўляецца не дагматычны чорна-белы падзел персанажаў на злачынцаў і праведнікаў, а паглыбленае адлюстраванне драматычнага лёсу чалавека і спектру яго пачуццяў, яго слабасцей, што могуць весці да згубнай страты этычных абсалютаў у сувязі з абставінамі і выпрабаваннямі жыцця.

Найбольш выразна ўплыў філасофіі экзістэнцыялізму на «новага» В. Быкава выявіўся ў аповесці «У тумане» (1988). В. Быкаў – адзін з першых беларускіх аўтараў, хто на стыку стагоддзяў паглыбіўся ў псіхалогію чалавека і разбурыў адназначныя, стэрэатыпныя вобразы правых і вінаватых на вайне. Пісьменнік-гуманіст глыбока ўспрыняў экзістэнцыйныя філасофскія сентэнцыі пра жыццё і смерць у тупіку абсурднай рэчаіснасці, адкуль няма выйсця. Атрадны разведчык Бураў з аповесці «У тумане» маральна не гатовы выканаць заданне па ліквідацыі свайго знаёмага Сушчэні, на якога кінуты цень здрады. Партызан стаіць перад праблемай выбару. Фатальная гульня лёсу назіраецца ў эпізодзе капання Сушчэнем уласнай магілы і яго раптоўнага вызвалення ад смерці. У пісьменніка зыход чалавека з жыцця часта набывае якасць своеасаблівага вызвалення ад цяжару абставін: *«Ну, але, што ж, мусіць, усё мае свой сэнс і свае законы. Чалавек не ўсё можа. Часам ён не можа нічога»* [14, с. 46]. Пераважная большасць твораў пісьменніка мае менавіта трагічную развязку. Частым элементам аналізу сітуацыі з'яўляецца ўнутраны маналог героя. Персанаж аповесці «У тумане» вядзе гутарку з самім сабой, прапускае абставіны праз свядомасць, робіць праекцыю на будучыню і знаходзіць для сябе адзінае выйсце – смерць. Галоўнае крэда героя – не згубіць уласнай годнасці, не нашкодзіць іншым людзям. Сушчэня думае пра лёс сям'і. В. Быкаў ставіць свайго персанажа ў безвыходную сітуацыю, калі знарок «падоранае» Сушчэню фашыстам Гросмаерам жыццё (на фоне расстрэлу ўсіх паплечнікаў Сушчэні па няўдалай дыверсіі на чыгунцы) азначае кампраметацыю героя ў вачах савецкіх партызан, суседзяў – усіх «сваіх». Смерць, найчасцей, з'яўляецца непазбежнасцю, як у выпадку з Буравым і Войцікам, што паміраюць ад кулі. Сушчэня, які сам страляе ў сябе, свядома робіць свой выбар у крытычнай сітуацыі. Сімволіка назвы твора «У тумане» таксама мае экзістэнцыйны пачатак. Усе персанажы, апынуўшыся ў своеасаблівым тумане, з'яўляюцца ахвярамі лёсу і абставін. Туман для Сушчэні – сістэма ў выглядзе праследу чалавека і несапраўднае жыццё, якое падараваў хітры немец Гросмаер. Туман для Войціка – імкненне існаваць па даваенных законах. Для Бурава своеасаблівым туманам з'яўляюцца абставіны, пры якіх трэба выканаць загад камандзіра атрада. Туманам выступае ваенная сітуацыя і людзі ў ёй: франтавікі, партызаны, акружэнцы.

Яшчэ адна быкаўская аповесць, «Сцюжа» (1969, 1991), па ідэйна-мастацкіх характарыстыках, прыёмах адлюстравання псіхалогіі асобы, формах супастаўлення гістарычных пластоў блізкая да аповесці «Знак бяды». Рукапіс «Сцюжы» быў канчаткова завершаны ў 1991 г. Аповесць паказвае раней забароненыя для адлюстравання старонкі беларускай гісторыі. У творы В. Быкаў робіць праекцыю падзей даваеннага і ваеннага перыядаў на будучыню, уздымае праблему чалавечага прызначэння і адказнасці. З пункту гледжання храналогіі ў творы ахоплены падзеі калектывізацыі і пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Ягор Азевіч – галоўны герой аповесці «Сцюжа» – прарываецца з акупаванай тэрыторыі да сваіх. Мінулая камсамольская і партыйная дзейнасць Азевіча ў раёне

паказана В. Быкавым рэтраспектыўна. Ягор пад прымусам Паліны робіць данос на свайго начальніка Зарубу. Пісьменнік перадаў душэўныя пакуты і ваганні маладога чалавека, які апраўдвае сваю маладушнасць і подлы ўчынак каханнем да Паліны. У выніку малады чалавек становіцца паслухмянай, безасабовай шрубкай дзяржаўна-бюракратычнага механізму. Для Ягора Азевіча сціраюцца межы сапраўднага і прывіднага, бо псіхіка яго нездаровая, апантаная мінулымі жорсткімі праявамі служэння сістэме. Ён бачыць у сне кроў на сваіх руках і трызніць пераслед ваўкалака. Асобнае выданне аповесці 1993 г. у якасці своеасаблівага эпіграфа мае фрагмент надпісу на прыдарожным абеліску, на якім сярод прозвішчаў партызан значыцца і імя Ягора Азевіча.

У перыяд 1990-х гг. празаік чарговы раз звярнуўся да апавядання як аднаго з мабільных жанраў асваення рэчаіснасці. Храналогію трагічных падзей айчыннай гісторыі з часоў Слуцкага паўстання 1920 г. да перыяду Вялікай Айчыннай вайны і брэжнеўскіх часоў адлюстроўваюць творы «На чорных лядах», «Бедныя людзі» (абодва – 1994), «Жоўты пясочак», «Зенітчыца», «Палкаводзец», «Палітрук Каламіец», «Падоранае жыццё» (усе – 1995). У 2001 – 2003 гг. пісьменнік таксама шмат сіл аддаў жанру апавядання. Ён падкрэсліваў значэнне кожнага дробнага эпізода гісторыі ў стварэнні аб’ектыўнага малюнку рэчаіснасці.

Аповесці «Пакахай мяне, салдацік» (1996) і «Балота» (2001) па тэматыцы працягваюць цыкл адзначаных апавяданняў і па-новаму адлюстроўваюць недастаткова асветленыя старонкі ваеннай рэчаіснасці, звязаныя з жорсткасцю і чужых, і сваіх да безабароннага жыхара акупаванай ворагам зямлі. Аповесць «Пакахай мяне, салдацік» прысвечана фіналу Вялікай Айчыннай вайны, пра што сказана ў звыклай для пісьменніка някідкай форме напачатку твора: «*Мы ўперліся ў нямецкі абарончы рубеж за невялікім аўстрыйскім гарадком і трэці дзень стаялі на месцы*» [8, с. 424]. Дзеянне развіваецца ў ваколіцах Аўстрыйскіх Альп і мае аўтабіяграфічную аснову, бо менавіта там В. Быкаў сустрэў перамогу. Як адзначыў Д. Бугаёў [15], падзеі адбываюцца пры наяўнасці традыцыйна невялікага кола дзейных асоб, абмежаванасці топасу і часу дзеяння. Асновай канфлікту і сюжэтнай лініі аповесці выступае каханне камандзіра ўзвода супрацьтанкавых гармат Змітрака Барэйкі да зямлячкі Франі, вывезенай на паднявольную працу і аддадзенай у распараджэнне сям’і Шарфаў. Гвалтоўная смерць Франі ў фінале падкрэслівае трагізм лёсу такіх паланянак, якім надзвычай цяжка было вярнуцца да мірнага жыцця на радзіме. Абвостраны паказ ваеннай рэчаіснасці ў аповесці «Пакахай мяне, салдацік» заключаецца ў адлюстраванні пісьменнікам жорсткасці паводзін не толькі заваёўнікаў, але і сваіх: тыранія камандзіраў у адносінах да салдат, дзеянні партыйных работнікаў і смершаўцаў. Уздымае В. Быкаў у творы і складаную тэму акружэнцаў, да якіх у 1940-я гг. было негатыўнае стаўленне. Па-новаму – праўдзіва і без налёту афіцыёзнасці – пісьменнік паказвае сустрэчу на Эльбе савецкіх і амерыканскіх войск. Падчас сустрэчы гучыць песня «Пакахай мяне, салдацік», якая стала загалоўкам і лейтматывам твора. Неаптымістычны прагноз В. Быкава на далейшае жыццё пры савецкай уладзе падаецца праз адлюстраванне рэфлексіі персанажаў аповесці. Прафесар Шарф у размове з Барэйкам выказвае думку, неверагодную для маладога савецкага камандзіра – пра роднасную прыроду фашызму і камунізму: «*Замест немцаў тут жа завалодараць рускія*» [8, с. 457]. У познесавецкія часы, у перыяд галоснасці гэтая думка зрабілася ўжо агульнавядомай у СССР. У творы «Пакахай мяне, салдацік» В. Быкаў дэманструе лепшыя традыцыі аповеду: лаканічнасць, дакладнасць мастацкіх дэталей, нагляднасць пейзажных замалёвак. Баец-ветэран палемічна і балюча раскрывае праўду пра мінулую вайну, песімістычна распавядае пра трагізм быцця сваіх герояў. Праз пагібель Франі ў фінале вайны аўтар малюе бесперспектыўнасць будучыні простага чалавека, завастраючы ўвагу на праблеме дабра і зла. Экзістэнцыйным пафасам поўняцца апошнія сцэны аповесці, дзе гаворка ідзе пра пахаванне беларускай дзяўчыны Франі і нямецкіх салдат на адных могілках. Пісьменніка адрознівае псіхалагізм, канкрэтнасць і акцэнтуацыя пры абмалёўцы мастацкіх дэталей: «*Я закопваў Франю. Гарнуў і гарнуў рыдлёўкай на чорную накрыўку труны. Як яна схавлася за жвірам, крыху перадыхнуў і пачаў сунуць жвір зноў. Так да самага верху магілы*» [8, с. 501]. Дынамічная змена часу і прасторы, павелічэнне колькасці разнапланавых персанажаў стала пазнакай раманнага мыслення ў прозе В. Быкава.

У апошні перыяд жыцця ў светапоглядзе В. Быкава, на думку М. Тычыны, назіраюцца элементы касмізму і фаталізму. Вера ў Бога, паводле В. Быкава, з’яўляецца абаронай ад праяў акаляючай рэчаіснасці. М. Тычына, маючы на ўвазе найперш творчасць пісьменніка, адзначаў [16, с. 198] стварэнне ў беларускай літаратуры метафізічнай мовы. Тэма боскага найбольш непасрэдна і канкрэтна прагучала ў празаіка на старонках аповесці «Знак бяды», дзе відавочная сувязь гістарычных пластоў праз біблейскія матывы. Пятрок Багацька перад прыходам немцаў звяртаецца да Бога, успамінаючы яго і падчас пераносу драўлянага крыжа на гару Галгофу. Назва гары (Галгофа) таксама адсылае да Бібліі, з’яўляючыся пры гэтым праекцыяй на рэальнае жыццё селяніна. У аповесці «У тумане» чытаем пра параненага, а пасля нежывога Бурава, якога Сушчэня сімвалічна нясе на плячах, нібы крыж Хрыста. Паказальны ў творы матыў дарогі: да сябе, сваіх, выратавання. Тая ж сімволіка крыжа прысутнічае і ў аповесці «Пакахай мяне, салдацік». Хрысціянскія матывы ў позніх творах В. Быкава паказваюць месца рэлігійных канонаў у жыцці сучаснага чалавека.

Паводле меркавання Д. Бугаёва, назвы некаторых твораў пісьменніка намякаюць на адмоўныя праявы свету і трагізм чалавечага існавання (аповесці «Пастка», «У тумане», «Аблава», «Сцюжа», «Балота», інш.). Пісьменнік у фінале жыцця казаў пра ўласны песімізм адносна будучыні: «Мабыць, кожнаму свой шлях да свабоды наканавана прайсці асобна. Усё ж індывідуалізм і ў гэткім аблічы – не самы горшы кірунак да яе» [6, с. 539]. І. Фіхтэ сцвярджаў [17, с. 41], што чалавек мае сваё прызначэнне і павінен дзейнічаць у адпаведнасці з ім, ствараючы быццё. В. Быкаў вызначыўся, што чалавек павінен усведамляць асабістыя духоўныя мэты, а не ўсялякім коштам адпавядаць сацыяльнай кан’юнктуры.

**Заключэнне.** Для В. Быкава перыяд 1980 – 1990-х гг. у творча-выяўленчым плане зрабіўся адметным распрацоўкай новых аспектаў з падзей мінулага і зваротам да сучаснасці. Развіццё атрымала паэтыка прытчы ў жанры апавядання. Таксама ва ўсіх жанрах быкаўскай прозы паглыбілася экзістэнцыйнае светаадчуванне, якое пачало пераважаць у адлюстраванні праблем маральнага выбару чалавека ў быційных сітуацыях. У самім жанры аповесці таксама адбылася эвалюцыя. Напісаная ў 1982 г. аповесць «Знак бяды» ўпершыню засведчыла, што В. Быкаў перайшоў да непасрэднага адлюстравання сувязі розных гісторыка-культурных эпох, перажытых беларусамі ў першай палове XX ст. Гэта не толькі павялічыла аб'ём аповесці, але і ўскладніла яе архітэктоніку настолькі, што даследчыкі пачалі гаварыць пра раманнае мысленне В. Быкава. Аналагічнымі жанравымі зменамі характарызуецца і аповесць «Кар'ер», а таксама скончаная ў 1991 г. аповесць «Сцюжа». Тым не менш В. Быкаў напрыканцы жыцця стварыў і некалькі жанравых узораў той сваёй аповесці, якая мае статус класічнай: з абмежаванай колькасцю персанажаў і лаканізмам у сюжэтабудаванні. Такімі аповесцямі позняга В. Быкава зрабіліся «У тумане», «Пакахай мяне, салдацік», «Балота» (2001), таксама няскончаная аповесць «Бліндаж». У іх адразу пазнаюцца вобразы тыповых быкаўскіх герояў-беларусаў – бязвінных ахвяр. У названых творах асноўны ідэйны акцэнт зроблены на трагічнай безвыходнасці ў лёсе мірнага жыхара-беларуса, які трапляе ў жорны вайны. Пры гэтым палемічны пафас пісьменніка зменшыўся і амаль цалкам саступіў экзістэнцыйна-засмучанаму. Пісьменнік на сыходзе жыцця пісаў пра свой вопыт спазнання дабра і зла на вайне ўжо цалкам адкрыта, узмацняючы традыцыйны гуманістычны пафас і думку пра неабходнасць маральна-этычных імператываў для кожнай асобы. В. Быкаў – адзін з першых беларускіх аўтараў, хто звярнуўся да псіхалогіі чалавека і разбурыў адназначныя, стэрэатыпныя вобразы правых і вінаватых на вайне. Мастак глыбока ўспрыняў экзістэнцыйныя філасофскія сентэнцыі пра жыццё і смерць у тупіку абсурднай рэчаіснасці, адкуль няма выйсця. Разам з гэтым у жанры аповесці пісьменнік адлюстроўвае найперш уласна-беларускую, гістарычна-канкрэтную праўду пра Вялікую Айчынную вайну. Хрысціянскія матывы, якія значна паглыбіліся ў позніх творах В. Быкава, таксама выконваюць ролю своеасаблівых адсылак да сучаснасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. Быкаў, В. Праўдай адзінай: Літаратурная крытыка, публіцыстыка, інтэрв'ю / В. Быкаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. – 262 с.
2. Дзюбайла, П.К. Панарама сучаснай беларускай прозы : літ.-крытыч. арт. / П.К. Дзюбайла. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. – 192 с.
3. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: У.В. Гніламёдаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1999–2015. – Т. 3 : 1941–1965. – 2002. – 952 с.
4. Навумовіч, У.А. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. / У.А. Навумовіч. – Мінск : Вышэйшая школа, 2007. – 478 с.
5. Бельскі, А.І. Вывучэнне творчасці пісьменнікаў: класікі і сучаснікі ў школе / А.І. Бельскі. – Мінск : Аверсэв, 2005. – 352 с.
6. Быкаў, В. Доўгая дарога дадому / В. Быкаў. – Мінск : ГАБТ Кніга, 2003. – 539 с.
7. Бугаёў, Д.Я. Спавядальнае слова. Літаратура, крытыка, успамін / Д.Я. Бугаёў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2001. – 325 с.
8. Быкаў, В. Пакахай мяне, салдацік : аповесці, апавяданні / В. Быкаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. – 574 с.
9. Локун, В.І. Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры / В.І. Локун. – Мінск : Тэхнапрынт, 2005. – 228 с.
10. Афанасьев, И. Кто восходит на Голгофу? Антивоенная идея в творчестве Василя Быкова / И. Афанасьев. – Минск : Мастацкая літаратура, 1993. – 160 с.
11. Прохорова, Т.Г. Жанровое своеобразие повести В. Быкова «Карьер» / Т.Г. Прохорова // Жанровое многообразие художественной литературы : межвуз. сб. науч. тр. / Сарат. гос. пед. ин-т ; редкол.: Т.Д. Белова (отв.) [и др.]. – Саратов, 1990. – С. 95–108.
12. Быкаў, В. Кар'ер / В. Быкаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1987. – 302 с.
13. Быкаў, В. Бліндаж. Аповесці. Бібліятэчка «Дзеяслова» / В. Быкаў. – Мінск : Выд. В. Хурсік, 2006. – 192 с.
14. Быкаў, В. У тумане: Аповесці / В. Быкаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – 383 с.
15. Бугаёў, Д. Трагедыя на зыходзе вайны: аповесць В. Быкава «Пакахай мяне, салдацік» / Д. Бугаёў // Роднае слова. – 1997. – № 2. – С. 10–21.
16. Тычына, М.А. Філасофія літаратуры: беларускі варыянт / М.А. Тычына. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 324 с.
17. Философия / Т.И. Кохановская [и др.]. – Ростов-н/Д. : Феникс, 2001. –575 с.


## REFERENCES


1. Bykaŭ, V. (1984). *Praŭdai adzinai: Litaraturnaya krytyka, publitsystyka, interv'yu.* Minsk: Mastatskaya litaratura. (In Beloruss.).
2. Dzyubaila, P. (1986). *Panarama suchasnai belaruskai prozy: Lit.-krytych. artykuly.* Minsk: Mastatskaya litaratura. (In Beloruss.).
3. *Gistoryya belaruskai litaratury XX stagoddya* (2002). In 3 vol., Vol. 3*1941–1965*). Minsk: Belaruskaya navuka. (In Beloruss.).
4. Navumovich, U. (2007). *Belaruskaya litaratura: vucheb. dapam.* Minsk: Vysheishaya shkola. (In Beloruss.).
5. Bel'ski, A. (2005). *Vyvuchenne tvorchastsi pis'mennikaŭ: klasiki i suchasniki ŷ shkole.* Minsk: Aversev. (In Beloruss.).
6. Bykaŭ, V. (2003). *Doŷgaya daroga dadomu.* Minsk: GABT Kniga. (In Beloruss.).
7. Bugaeŷ, D. (2001). *Spavyadal'nae slova. Litaratura, krytyka, uspamin.* Minsk: Mastatskaya litaratura. (In Beloruss.).
8. Bykaŭ, V. (2013). *Pakakhai myane, saldatsik: apovestsi, apavyadanni.* Minsk: Mastatskaya litaratura. (In Beloruss.).
9. Lokun, V. (2005). *Vasil' Bykaŭ u kantekstse susvetnai litaratury.* Minsk: Tekhnaprynt. (In Beloruss.).
10. Afanas'ev, I. (1993). *Kto voskhodit na Golgofu? Antivoennaya ideya v tvorchestve Vasilya Bykova.* Minsk: Mastatskaya litaratura. (In Russ.).

11. Prokhorova, T. (1990). Zhanrovoe svoeobrazie povesti V. Bykova «Kar'er». In. T.D. Belova (Eds.) *Zhanrovoe mnogoobrazie khudozhestvennoi literatury*. Saratov: Saratov state pedagogical institute, (9–15). (In Russ.).
12. Bykaŭ, V. (1987). *Kar'er.* Minsk: Mastatskaya litaratura. (In Beloruss.).
13. Bykaŭ, V. (2006). *Blindazh. Apovestsi. Bibliyatechka «Dzeyaslova».* Minsk: Vyd. V. Khursik. (In Beloruss.).
14. Bykaŭ, V. (1989). *U tumane: Apovestsi.* Minsk: Mastatskaya litaratura. (In Beloruss.).
15. Bugaeŭ, D. (1997). Tragedyya na zykhodze vainy: apovests' V. Bykava «Pakakhai myane, saldatsik» [Tragedy at the end of the war: V. Bykov's novella «Love me, soldier Boy»]. *Rodnae slova [Native word]*, *(2),* 10–21. (In Beloruss., abstr. in Engl.).
16. Tychyna, M. (2014). *Filasofiya litaratury: belaruski varyyant.* Minsk: Belaruskaya navuka. (In Beloruss.)
17. *Filosofiya* (2001). *[Trust: philosophy]* (2001). Rostov-na-Donu: Feniks. (In Russ.).

*Пастyпiў 17.12.2021*

## ТРАНСФОРМАЦИЯ ХУДОЖЕСТВЕННЫХ КАТЕГОРИЙ И ОБРАЗОВ В ОСВОЕНИИ ВОЕННОЙ ТЕМЫ В. БЫКОВЫМ В ПОВЕСТИ 1980-х – 199-х гг.

***Т.Р. БОГОРАДОВА***

*Рассматривается эволюция художественных образов и категорий в жанре повести известного классика белорусской литературы В. Быкова в период 1980-х – 1990-х гг. Анализируются так называемые «горизонтальные» литературные влияния, которые прослеживаются через художественные взаимодействия писателя с другими авторами (преимущественно представителями «лейтенантской прозы»), ровесниками, коллегами по перу. Прослеживается жудожественный путь В. Быкова от воплощения идей «ремаркизма», партизанских повестей до притчево-пораболического отражения реальности и использования экзистенциальной эстетики. Антивоенный пафос и реализм выводят художника, а вместе с тем и национальное писательство, на мировой уровень. Бывший фронтовик В. Быков в литературе занимался прежде всего поисками человека, что вылилось в идейно-эстетическую поэтику жанра повести.*

***Ключевые слова:*** *реалистическая поэтика, экзистенциальное мироощущение, ремаркизм, притчевое начало, гуманистический пафос, метафизический язык.*

## TRANSFORMATION OF ARTISTIC CATEGORIES AND IMAGES DURING THE DEVELOPMENT OF THE MILITARY THEME BY V. BUKOV IN THE STORY OF THE 1980s – 1990s

***T. BAGARADAVA***

*The evolution of artistic images and categories in the genre of the novel by the famous classic of Belarusian literature V. Bykov in the period of the 1980s – 1990s is considered. The so-called «horizontal literary» influences are analyzed, expressed through the writer's artistic relationships with other authors (mainly representatives of «lieutenant prose»), peers, colleagues in pen. V. Bykov's artistic path is traced from the embodiment of the ideas of «remarkism», partisan stories to the parable-parabolic reflection of reality and the use of existential aesthetics. Anti-war pathos and realism bring the artist, and at the same time, the national writing, to the world level. The former front-line soldier V. Bykov in literature was primarily engaged in the search for a person, which is manifested through the ideological and aesthetic poetics of the novel genre.*

***Keywords:*** *realistic poetics, existential attitude, remarkism, parable principle, humanistic pathos, metaphysical language.*